І.І. Бубновіч (Гродна, ГрДУ)

# ТЭРМІНЫ ДЗЯРЖАЎНАЙ БЯСПЕКІ Ў КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ І Ў СМІ

Адным з паказальнікаў здароўя і жыццяздольнасці грамадства, дакладным крытэрыем ацэнкі яго эканамічнага развіцця, маральнага стану, адносінаў да чалавека з'яўляецца ўзровень рашэння праблем забеспячэння жыццядзейнасці чалавека, бяспека яго членаў і ўсяго грамадства, дзяржавы ў цэлым.

Складаным і шматаспектным з'яўляецца пытанне аб складзе групы тэрмінаў дзяржаўнай бяспекі, ступені яе разгалінаванасці, асаблівасцях развіцця на сучасным этапе.

Аналіз лексікаграфічных прац [5], юрыдычна-справавых тэкстаў [6], матэрыялаў СМІ дае магчымасць вызначыць, што пад паняццем 'тэрміны дзяржаўнай бяспекі'трэба разумець частку лексічнай сістэмы беларускай мовы, якая адлюстроўвае стан грамадскіх, міжнацыянальных адносін, пры якім сацыяльным суб'ектам і дзяржаве ніхто і нішто не пагражае, абароненасць краіны ад знешніх і ўнутраных пагроз яе існаванню, а таксама сістэму захадаў органаў, функцый дзяржавы і грамадства па абароне інтарэсаў краіны, народа, грамадзян. Гэтай падсістэме адпавядаюць пераважна састаўныя тэрміны (складаюцца з двух і больш кампанентаў), апорным кампанентам большасці з іх з'яўляецца *бяспека* 'адсутнасць пагрозы'.

Ядро дадзенай падсістэмы складаюць тэрміны *бяспека дзяржаўная і бяспека нацыянальная,* якія часам разглядаюцца як сінонімы'грамадскія, унутры- і міжнацыянальныя адносіны, якія забяспечваюць абароненасць ад знешніх і ўнутраных пагроз як насельніцтву канкрэтнай дзяржавы, так і самой дзяржаве ў цэлым' [5, с. 69].

Сюды ж уключаем і наступныя тэрмінаадзінкі, якія могуць суадносіцца з рознымі сферамі грамадскага жыцця: *бяспека харчовая* (*паліт., экан.*) 'абароненасць сістэмы харчовага забеспячэння насельніцтва краіны, пры якой гарантуецца захаванне і развіццё адпаведнай вытворчай базы, неабходных рэсурсаў і запасаў, дастатковае па медыцынскіх нормах забеспячэнне жыхароў асноўнымі прадуктамі харчавання; адзін са складнікаў эканамічнай бяспекі', *бяспека эканамічная* (*паліт., экан.*) 'абароненасць сацыяльна-эканамічнай сферы дзяржавы ад унутраных і знешніх негатыўных уздзеянняў', *бяспека энергетычная* (*паліт., энерг.*) 'гарантыя надзейнага і бесперабойнага энергазабеспячэння краіны ў звычайных умовах і надзвычайных сітуацыях', *калектыўная бяспека* (*паліт., дыпл.*) 'сістэма абароны інтарэсаў некалькіх дзяржаў, у тым ліку абароненасць ад знешняй агрэсіі', *органы дзяржаўнай бяспекі* (*спец.*) 'сістэма ўстаноў, якія арганізуюць абарону краіны ад знешніх і ўнутраных пагроз яе існаванню', *бяспека пажарная і супрацьпажарная* (*спец.*) 'адсутнасць пагрозы ўзнікнення ўзгаранняў; сістэма дзяржаўных служб, мерапрыемстваў і дзеянняў, накіраваных на прадухіленне пагрозы ўзгаранняў',

*бяспека працы* (*спец.*) ‘аптымальны баланс стану працоўных месцаў і паводзінаў чалавека, які абмяжоўвае ўздзеянне на работніка ў працэсе працы небяспечных і шкодных вытворчых фактараў’.

Заканадаўчыя і нарматыўныя акты, указы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, накіраваныя на прадухіленне пагроз са знешняга боку, забеспячэнне развіцця суб’ектаў грамадства, на жаль, у большасці даступныя на рускай мове, аперуюць наступнымі тэрмінамі: *нацыянальная бяспека, нацыянальныя інтарэсы, крыніца пагрозы нацыянальнай бяспецы, пагроза нацыянальнай бяспецы, палітычная бяспека, эканамічная бяспека, навукова-тэхналагічная бяспека, сацыяльная бяспека, дэмаграфічная бяспека, інфармацыйная бяспека, ваенная бяспека, экалагічная бяспека*[6] (пераклад — мой).

Адна з крыніц, дзе выкарыстоўваецца сацыяльна значная лексіка, сярод якой і тэрміны дзяржаўнай бяспекі, — Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Пры даследаванні спецыяльнай лексікі і тэрміналогіі, адлюстраванай ў Канстытуцыі, намі адзначаны наступныя разрады тэрміналагічнай і прафесійнай лексікі: юрыдычная (*абвінавачанне***,** *абскарджанне, амністыя*), заканадаўчая (*дэкрэт, закон, указ*), эканамічная (*абарачэнне грашовае, плацёж, эмісія*), ваенная (*напад, пагроза*), палітычная (*беспарадкі, волевыяўленне*), сацыяльная (*беспрацоўе, забеспячэнне, занятасць*), тэрміналогія адміністрацыйна-дзяржаўнага кіравання (*камітэт, парламент, прэзідэнт*), тэрміналогія міжнароднай дзейнасці (*неўмяшанне, ратыфікацыя*), лексіка тэрміналагічнага і прафесійнага характару, звязаная з бяспекай жыццядзейнасці і здароўем чалавека (*інваліднасць, адпачынак, працаздольнасць*), лексіка, звязаная з дэкларацыяй правоў і свабод, а таксама з абмежаваннямі іх (*дыскрымінацыя, самасцвярджэнне, свабода*), адміністацыйна-канцылярская (*адмова, адхіленне, запыт*) і інш. [2].

Непасрэдна да тэрмінаў дзяржаўнай бяспекі, выкарыстаных ў Канстытуцыі, адносяцца: ***нацыянальная бяспека*** (*Абмежаванне правоў і свабод асобы дапускаецца толькі ў выпадках, прадугледжаных законам, у інтарэсах нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, абароны маралі, здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асоб*); ***грамадская карысць і бяспека*** (*Ажыццяўленне права ўласнасці не павінна супярэчыць грамадскай карысці і бяспецы, наносіць шкоды навакольнаму асяроддзю, гісторыка-культурным каштоўнасцям* (…)); ***органы бяспекі***(*Суддзі, пракурорскія работнікі, супрацоўнікі органаў унутраных спраў, Камітэта дзяржаўнага кантролю, органаў бяспекі, ваеннаслужачыя не могуць быць членамі палітычных партый і іншых грамадскіх аб’яднанняў* (…)); а таксама ***Савет бяспекі Рэспублікі Беларусь*** (*фарміруе і ўзначальвае Савет бяспекі Рэспублікі Беларусь* (…)) [2].

Сацыяльную значнасць названай падсістэмы тэрмінаў пацвярджае факт іх шырокага выкарыстання ў СМІ: ***нацыянальная бяспека*** (*Сістэма нацыянальнай бяспекі Беларусі павінна забяспечваць адэкватнае і аператыўнае рэагаванне на любыя выклікі і пагрозы* [http://zviazda.by/]),

***дзяржаўная бяспека*** (*Разам з тым, у большасці краін Еўропы найбольшую небяспеку дзяржаўнай бяспецы бачаць у эканамічным крызісе* [http://by.belapan.by]) і інш. Заўважана, што паняцце, абазначанае тэрмінам ‘нацыянальная бяспека’, шырэй, чым дзяржаўная бяспека. Тэрмін дзяржаўная бяспека ў якасці кампанента ўваходзіць у састаўныя намінацыі (часцей назвы органаў).

У розных варыянтах ужываюцца тэрміны ***палітычная бяспека, ваенная бяспека*** (*Развіццё айчынных даследаванняў у сферы ядзернай энергетыкі павінна прынесці адчувальную карысць беларускай эканоміцы, сацыяльнай сферы, навуковаму патэнцыялу, а таксама ваеннай бяспецы краіны* [http://zviazda.by/]; *Ён таксама падкрэсліў, што ваенна-палітычныя бяспека і баланс зноў становяцца вострай і важнай стратэгічнай тэмай для ўсёй Еўропы.* [http://zviazda.by/]). Выяўлена вялікая колькасць прыкладаў ужывання тэрмінаадзінак ***эканамічная бяспека*** (*Атамная энергія — гэта энергетычная, а значыць — эканамічная бяспека краіны* [4]); ***навукова-тэхналагічная бяспека*** ((…) *доля штогод рэалізуемай інавацыйнай прадукцыі ў Беларусі не дасягнула парога навукова-тэхналагічнай бяспекі 20 %* [http://president.gov.by/by/]); ***дэмаграфічная бяспека*** (*На ўмацаванне здароўя жанчын і дзяцей у нашай краіне накіраваны Нацыянальная праграма дэмаграфічнай бяспекі* (…) [4]); ***інфармацыйная бяспека*** (*Да праблемных пытанняў электроннага апублікавання можна аднесці найперш пытанні забеспячэння інфармацыйнай бяспекі* [http://zviazda.by/]; ***экалагічная бяспека*** (*Экалагічная бяспека будаўнічых матэрыялаў і мэблі з дрэва залежыць ад іх насычэння і пакрыцця* [http://zviazda.by/]).

Назва *савет бяспекі* ў СМІ канкрэтызуецца за кошт уключэння ў яе склад новых кампанентаў (*Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў 19 ліпеня рабочую сустрэчу з дзяржаўным сакратаром Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь Леанідам Мальцавым* [http://zviazda.by/]); *Заходнія краіны спрабуюць дамагчыся прыняцця Саветам Бяспекі ААН рэзалюцыі па Сірыі* (…) [http://zviazda.by/]; *Аб гэтым учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з сакратаром Савета бяспекі Расіі Мікалаем Патрушавым* [http://zviazda.by/]).

Слоўнік [5] фіксуе і іншыя тэрміны, якія датычацца непасрэдна або закранаюць пытанні, звязаныя з нацыянальнай бяспекай дзяржавы:*бяспека еўрапейская* [5, с. 69], *бяспека міжнародная* [5, с. 69], *бяспека рэгіянальная* [5, с. 70], *бяспека ўзаемная* [5, с. 70].

У СМІ выкарыстоўваюцца тэрмінаадзінкі, якія, на наш погляд, таксама адносяцца да аналізаванай групы і сведчаць пра яе інтэнсіўнае развіццё:***радыяцыйная бяспека*** (*пабачылі, як ажыццяўляецца кантроль за радыяцыйнай бяспекай* (…) [4]); ***энергетычная бяспека*** *(Ён зазначыў, што энергетычная бяспека і навуковы прагрэс з'яўляюцца ключавымі фактарамі ўстойлівага развіцця дзяржаў* [http://by.belapan.by]); ***ядзерная бяспека*** (*Ядзерная бяспека для нас галоўны прыярытэт* [http://zviazda.by/]; ***калектыўная бяспека*** (*Сесію Савета калектыўнай бяспекі Арганізацыі*

*Дагавора аб калектыўнай бяспецы плануецца правесці 23 снежня* [http://zviazda.by/]).

Для стабільнага функцыянавання грамадстваважнай з'яўляецца ***пажарная бяспека*** (*Камісію цікавіць усё: падрыхтоўка класаў, добраўпарадкаванне тэрыторыі, наяўнасць планаў вучэбнай і выхаваўчай работы, пажарная бяспека* (…) [4]). Тэрмін уступае ў адносіны сінаніміі з ***супрацьпажарная бяспека*** (*Асаблівая ўвага на пасяджэнні савета была ўдзелена праблеме супрацьпажарнай бяспекі* [4]). СМІ адлюстроўваюць узрастанне ролі ***камп'ютарнай бяспекі*** (*Сярод папулярных спецыяльнасцяў, якія выбралі выпускнікі, — правазнаўства, бухгалтарскі ўлік і аўдыт, журналістыка, камп'ютарная бяспека* (…) [4]); ***прафесійнай бяспекі*** ((…) *арганізаваны раённай камісіяй па прафілактыцы вытворчага траўматызму і прафесійнай бяспекі сумесна са Смаргонскай міжраённай інспекцыяй працы* [4]); ***бяспекі жыццядзейнасці*** (*Рэгулярна папаўняць новым матэрыялам куткі па асновах бяспекі жыццядзейнасці ў класах* [4]).

У дадзеную групу, з пэўнай агаворкай, мы ўключылі тэрмінаадзінку *асабістая бяспека*, бо грамадская, нацыянальная бяспека немагчыма без бяспекі асобы. У СМІ сустракаем: *Выснова напрошваецца сама сабою: калі людзі не будуць клапаціцца аб асабістай бяспецы, то за іх гэта ніхто не зробіць* [4]. Закладваюць асновы нацыянальнай бяспекі *тэхнікабяспекі*; *сістэма бяспекі*; *бяспека працы; правілы бяспекі* [4].

На сучасным этапе развіцця сацыяльна значнай лексікі і тэрміналогіі адзначаецца пашырэнне словазлучэнняў тыпу *захаванне бяспекі, забеспячэнне бяспекі*; назвы мерапрыемстваў і праграм на розных узроўнях, накіраваныя на рэалізацыю бяспекі [4].

У якасці падагульнення зазначым, што прааналізаваная група не функцыянуе ізалявана: кожны тэрмін дзяржаўнай бяспекі семантычна звязаны з іншымі сацыяльна значнымі лексемамі і тэрмінамі: *пагроза, здароўе, адносіны, правы, свабоды, суверэнітэт, фактар* і інш.

У дадзенай групе выяўлены не толькі адносіны сінаніміі (*нацыянальная бяспека* і *дзяржаўная бяспека*), мнагазначнасці (*міжнародная бяспека* [5, с. 69]), але і варыянтнасць тэрмінаў (*дзяржаўная бяспека* і *бяспека дзяржавы*),адносіны антаніміі (*бяспека* і *небяспека грамадская),* таму асноўныя семасіялагічныя характарыстыкі тэрміна (адназначнасць, адсутнасць сінаніміі, дублетнасці) праяўляюцца як асноўныя тэндэнцыі [3, с. 25], але не рэалізуюцца поўнасцю, што выклікана спецыфікай паняцця, абазначанага названымі тэрмінамі.

Аналіз спецыяльнай лексікі і тэрміналогіі, звязанай з дзяржаўнай і нацыянальнай бяспекай, паказвае яе дынамічнае развіццё і папаўненне за кошт двухкампанентных намінацый, утвораных па мадэлі 'адносны прыметнік + назоўнік' (*харчовая бяспека, камп'ютарная бяспека*), ускладненне двухкампанентных тэрмінаў (*пагроза нацыянальнай бяспецы*), якія актыўна выкарыстоўваюцца ў СМІ і юрыдычна-прававаых дакументах.

Падрыхтавана ў рамках праекта, які рэалізуецца пры падтрымцы БРФФД (дагавор № Г15Р-029 ад 04.05.2015).

**ЛІТАРАТУРА**


1. Беларускі N-корпус [Электронный ресурс]. — Рэжым доступу: http://bnkorpus.info/. — Дата доступу: 07.03.2017.
2. Канстытуцыя Рэспублики Беларусь [Электронный ресурс]. — Рэжым доступу: http://belconstitution.narod.ru/constitution1996.htm#. — Дата доступу: 07.03.2017.
3. Комарова, З.И. Семантическая структура специального слова и ее лексикографическое описание. — Свердловск, 1991.
4. Корпус региональной и зарубежной прессы [Электронный ресурс] // Национальный корпус русского языка. — Рэжым доступу: http://www.ruscorpora.ru/search-regional.html. — Дата доступу: 05.03.2017.
5. Шынкароў, В.В., Раманава, С.П. Беларускі палітычны слоўнік. — Мінск, 2011.
6. Указ Президента Республики Беларусь от 9 ноября 2010 г. N575 "Об утверждении Концепции национальной безопасности Республики Беларусь" [Электронный ресурс]. — Рэжым доступу: http://www.pravo.by/document/?guid=3871&p0=P31000575. — Дата доступу: 28.03.2017.